**УДК 72.017.4**

# СУЧАСНЫЯ АСПЕКТЫ ВЫЯЎЛЕННЯ АСНОЎНЫХ ХАРАКТАРЫСТЫК НАЦЫЯНАЛЬНАГА КАЛАРЫТУ Ў КОЛЕРАВАЙ КУЛЬТУРЫ І АРХІТЭКТУРЫ БЕЛАРУСІ

***В.А. БАДЗЯКА, М.В. КАБАЕВА***
***(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту, Гомель);***
***Г.І. ЗАХАРКІНА***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Полацк)***

*Разгледжаны асноўныя складнікі колеравай культуры. Падкрэслена ўзаемасувязь набыткаў старадаўняй беларускай архітэктуры і колеравай культуры з развіццём сучасных тэндэнцый у пошуку нацыянальнага каларыту ў архітэктуры. На прыкладах твораў народнага мастацтва і архітэктуры Беларусі праведзена параўнанне эмацыйнага стану чалавека з каларыстыкай атачаючай прасторы.*

***Ключавыя словы**: колеравае асяроддзе, культура, колер, фарба, эмацыйна-псіхалагічнае ўздзеянне, асацыяцыі, сімволіка, фармалізацыя, архітэктура, праект, графіка, жывапіс, нацыянальны каларыт.*

**Уводзіны.** На працягу эвалюцыі чалавечага грамадства на розных узроўнях яго развіцця фарміравалася і ў розных відах існавала эканамічнае, сацыяльнае і культурнае (у тым ліку нацыянальнае) асяроддзе. Важкай часткай усеагульнай культуры чалавецтва з'яўляецца *колеравая культура.* Яна характарызуецца сістэмай усталяваўшыхся асацыятыўных і сэнсавых значэнняў і адначасова адлюстроўвае шматзначную ролю колера ў жыцці грамадства. Культурная прастора ахоплівае розныя напрамкі чалавечай дзейнасці, а колер з'яўляецца неад'емнай часткай жыцця чалавека і яго атачэння. Здольнасць колера эмацыйна ўздзейнічаць на псіхіку чалавека на працягу тысячагоддзяў фарміравала ў свядомасці людзей розныя колеравыя асацыяцыі. З колерам суадносіліся як простыя прыродныя з'явы, так і *складаныя сімвалічныя і алегарычныя вобразы, якія замацоўваліся ў выглядзе колеравых знакаў.* На зараджэнне, фарміраванне і распаўсюджванне колеравай культуры, у першую чаргу, ўплываюць прыродна-кліматычныя, гісторыка-культурныя і псіхалагічныя фактары. Межы колеравай культуры вызначаюцца эпохай і геаграфічным арэалам, надзеленым выражанымі адметнасцямі рэгіёнаў.

**Асноўная частка.** Сучасная колеравая культура Беларусі і яе асобных рэгіёнаў фарміравалася пад уплывам асноўных прыродных складнікаў – кліматычных умоў, расліннасці і марфалагічных асаблівасцей тэрыторыі (рэльефу, фактуры паверхні, структуры глебы).

Прырода не надта вялікай Беларусі, размешчанай у сярэдніх шыротах усходняй Еўропы, не вельмі разнастайная, але дастаткова маляўнічая. Прыродны ландшафт на паўночным захадзе і поўначы рэспублікі адрозніваецца ад ландшафту паўднёвага і паўднёва-ўсходняга (малюнак 1).



*а* *б* *в* *г*

***а*** **– Полаччына;** ***б*** **– Віцебшчына;** ***в*** **– Магілёўшчына;** ***г*** **– Гомельшчына**

**Малюнак 1. – Маляўнічасць, каларыстыка і графіка беларускіх краявідаў**

Эстэтычнае ўздзеянне прыроднага атачэння на чалавека адлюстрўваецца і знаходзіць непасрэднае ўвасабленне ў народным побыце ў выглядзе ўпрыгожвання будынкаў і функцыянальных рэчаў – прыладаў для апрацоўкі зямлі, прадметаў ужытку, многім з якіх у даўнія часы людзі надвалі сімвалічнае значэнне. Гэтыя рэчы з'яўляліся асноўнымі носьбітамі колеру ў атачэнні чалавека (малюнак 2).

Найбольш выразна і яскрава колеравая культура выяўляецца ў аздабленні штучна створаных аб'ектаў і мастацкай творчасці, а яе кіруючай унутранай сілай з'яўляюцца *каларыстычныя ўпадабанні* (каляровыя перавагі) чалавека. З часоў старажытнасці каларыстычныя ўпадабанні фіксаваліся як у творах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, так і аб'ектах народнага дойлідства, а галоўнымі крытэрыямі ў іх былі прыгажосць і гарманічнасць колеравых спалучэнняў, якія ў далейшым станавіліся вызначальнымі фарбамі нацыянальнага каларыту і арнаменту.

Каларыстыка *старадаўняй архітэктуры Беларусі* заснавана на колерах асноўных старажытных будаўнічых матэрыялаў – каменя, дрэва, плінфы, цэглы, дахоўкі, якія фарміравалі ў паселішчах і гарадах аблічча пабудоў і агульную каларыстычную прастору.



**Малюнак 2. – Каляровая палітра ў народнай творчасці**

Гістарычна культурныя стасункі ўсіх рэгіёнаў Беларусі былі вельмі шырокія, і таму ў некаторых пабудовах старажытнай архітэктуры знаходзілі месца элементы ўсходніх культур (візантыйскай, персідскай, сірыйскай і інш.), аднак развіццё каларыстыкі беларускай архітэктуры мэтазгодна разглядаць ў кантэксце эвалюцыі архітэктурных стыляў еўрапейскай культуры. Матывы розных стыляў і ўзнікаючых новых тэндэнцый у іншаземным мастацтве праходзілі праз індывідуальнае творчае пераасэнсаванне мясцовымі дойлідамі-будаўнікамі, чые арыгінальныя новыя пабудовы арганічна ўпісваліся ў беларускую прыроду і архітэктуру.

Прафесар А.С. Сардараў на прыкладзе замка ў Міры дае характарыстыку ўздзеяння еўрапейскай архітэктуры на архітэктуру Вялікага Княства Літоўскага XVI–XVII стагоддзяў, у якой вельмі слушна адзначае адметную асаблівасць архітэктурнага і колеравага вырашэння Мірскага замка: "…Манументальныя лаканічныя формы вежаў і сцен упрыгожваў вытанчаны дэкаратыўны прыём цудоўнага спалучэння чырвона-карычневай цаглянай муроўкі са светла-шэрымі атынкаванымі нішамі. Гэты прыём узяты з прускай, польскай, прыбалтыйскай архітэктуры перыяду Рэнесансу, аднак тут ён "аславянены" – не такі строгі і правільны" (малюнак 3).



***а*** ***б***

***а*** **– замак у г. п. Мір як прадстаўнік старадаўняй беларускай архітэктуры. XIV–XVI стагоддзі;**
***б*** **– каларыстычная прастора забудовы жылога раёна ў Мінску. Пачатак XXI стагоддзя**

**Малюнак 3. – Супольнасць каляровых палітраў архітэктуры позняй готыкі і сучаснасці**

У далейшым развіцці беларускай архітэктуры выкарыстанне новых малярных прыладаў і фарбаў стымулявала развіццё новых каларыстычных упадабанняў у рэгіянальнай і мясцовай архітэктуры. Згарманізаваныя колеравыя спалучэнні адпавядалі прынятым у тагачаснай еўрапейскай архітэктуры стылёвым і каларыстычным плыням, якія выяўляліся ў вонкавым аздабленні грамадскіх, прыватных і храмавых пабудоў і, адпаведна, у інтэр'ерах. Помнікі баларускага дойлідства, якія захаваліся да нашых часоў, перажылі не адно перабудаванне, дайшлі да нас адрэстаўраванымі ў апошніх стылёвых выявах, па якіх мы ўзнаўляем аблічча даўніны і ганарымся імі як матэрыяльнай і духоўнай спадчынай.

Здаўна і да сённяшніх дзён у архітэктуры і мастацтве выкарыстоўваюцца псіхалагічныя якасці колеру. Пры грунтоўным вывучэнні ўздзеяння колеру на фарміраванне эмацыянальна-вобразных з'яў у чалавечай свядомасці даследчыкамі-псіхолагамі выяўлены непарыўныя ўзаемныя сувязі многіх складнікаў разумовай дзейнасці. Паставіўшы на мэту пошук колеравых сродкаў для выражэння нацыянальнага каларыту Беларусі, мы з намерам (наўмысна) засяродзілі ўвагу менавіта на *выкарыстанні фарбаў* для вонкавай перадачы асацыятыўна-вобразных уяўленняў чалавека, назіраючага праявы колеру ў архітэктурнай прасторы. Як вядома, пастаянная зменлівасць сузіраемых чалавекам з'яваў, вобразаў і рэчаў

залежыць ад пары года, стану надвор’я, асвятлення, а таксама ад ўмоў назірання, у выніку якіх мяняюцца колеравыя адценні ўсяго прыроднага і ўрбаністычнага атачэння.

Архітэктары ў сваіх творах (праектах) ствараюць для чалавека функцыянальнае асяроддзе, надзяляючы яго псіхалагічным камфортам, а на аснове другаснага апасрэдвання імкнуцца ўводзіць у аблічча пабудовы альбо прасторы рысы нацыянальнага каларыту, ужываючы найбольш тыповыя колеравыя ўпадабанні свайго рэгіёна. Напрыклад, адметнай рысай архітэктуры Гомельшчыны (у праектах і пабудовах перыяду 1990–2015 гадоў) з’яўляецца пашыранае выкарыстанне ў каларыстыцы гарадоў і паселішч вобласці дамініруючай палітры прыродных колераў, якую найбольш яскрава адлюстроўвае колеравае вырашэнне сяміпавярховага жылога дома, размешчанага ў цэнтральнай частцы горада Гомеля (малюнак, 4 *а*).

У структуры Гомеля ёсць асобныя жылыя ўтварэнні (мікраёны), у складзе якіх існуе вялікая колькасць дамоў, пафарбаваных разнастайнымі колерамі і з незвычайнай кампазіцяй. Аднак пры разглядзе здалёк гэта шматколернасць выглядае абагульнёна (у выніку эфекта паветравай перспектывы) і імкнецца да манахроміі, як, напрыклад, у мікраёне № 50 па Рэчыцкім праспекце (малюнак 4, *б*).



**а** **б**

***а*** **– каларыт жылога дома на вуліцы Веткаўскай у Гомелі. *Архітэктар І.І. Бельцюкава.* 2001;**
***б*** **– фрагмент гарадской прасторы жылога раёна. Від на мікраён № 50. Вуліца Косарава. Гомель. 2017**

**Малюнак 4. – Каларыт паўднёвага рэгіёна Беларусі і яго ўвасабленне ў архітэктуры**

У дадзенай глыбінна-прасторавай кампазіцыі архітэктары ўжылі прынцып колеравага кантрасту: на амаль нейтральным фоне забудовы размясцілі насычаныя колеравыя акцэнты (зялёны і чырвоны), якія надаюць прасторы энергічную напоўненасць, гледачу – вясёлы настрой, а пры разглядзе з пэўных відавых кропак нават выклікаюць асацыяцыі з фарбамі дзяржаўнай сімволікі Беларусі (гл. малюнак 4, б).

Як вядома, сучасная архітэктура Беларусі вызначаецца інтэрнацыянальнасцю, універсалізаванасцю, пошукамі новых інжынерных тэхналогій і адначасова *пошукамі найноўшых сродкаў алюстравання нацыянальных і рэгіянальных рысаў краіны.* Сучасныя метады архітэктурнай каларыстыкі, уключаючыя багатыя кампазіцыйныя сродкі, выкарыстоўваюцца пры ўвасабленні ў жыццё новых праектаў гарадоў, мікраёнаў і іншых аб’ектаў, складаючых архітэктурнае асяроддзе. Каб раскрыць фарбамі бачанне ёмістага і тонкага паняцця нацыянальнага каларыту ўжываюцца тэхнічныя прыёмы колеравай графікі, так званыя фармалізаваныя выявы ў выглядзе фарбавых накрасаў, якія ў семантыцы вызначаны як іканічныя знакі, знакі-індэксы і знакі-сімвалы. На малюнку 5 прадстаўлены работы*, прысвечаныя пошуку асацыяцый і вобразаў Беларусі ў колеры.



**Малюнак 5. – Знак-індэкс “Беларусь”**

Прыкладам пошуку вонкавых сродкаў для перадачы ў архітэктуры абагульнёнага вобраза нашай краіны могуць быць конкурсныя дызайн-праекты павільёна Беларусі для ЭКСПО-2020. Удзельнікі архітэктурнага конкурсу, імкнуліся стварыць асацыятыўны сімвал краіны. Па ўмовах конкурсу ў дызайн-

* Работы будучых архітэктараў БелДУТ.

праектах неабходна было праз сінтэз мастацтваў матэрыялізаваць галоўныя мэты развіцця чалавечай супольнасці: “Спрыяльная магчымасць”, “Устойлівае развіццё”, “Мабільнасць”. Адным з галоўных пытанняў было, як кампазіцыйна і ў лаканічнай форме сумясціць пpасторавыя канструкцыі сучаснай архітэктуры з элементамі мастацкага выражэння нацыянальнага каларыту (малюнкі 6, 7*).




*а*

*б*




*в*



***а*** **– “Беларусь і Шаўковы пуць”. *А. Дзячэнка, Ю. Мішчанка, А. Петрачэнка*;**
***б*** **– “Васілёк”. *Г. Дудашэнка, А. Скварцоў*; *в* – “Аазіс”. *М. Зубараў, В. Казлоў***

**Малюнак 6. – Знакі, сімвалы і алегорыі як сродкі для выражэння нацыянальнага характару і каларыту ў архітэктуры павільёна Беларусі на ЭКСПО-2020**

* Работы будучых архітэктараў БелДУТ.

Кожны з прадстаўленых праектаў утрымлівае цікавыя і эмацыянальна-вобразныя складнікі. Так, канцэпцыя праекта "Беларусь і Шаўковы пуць" пабудавана на ідэі аднаўлення і актыўнага развіцця міжнародных сувязяў і стасункаў паміж краінамі Ўсходу і Захаду. Сімволіку агульначалавечага яднання аўтары выразілі ў вонкавай кампазіцыі павільёна, праз алегорыю "Слуцкі пояс". У адаптаванай да будаўніцтва форме гэты каштоўны залататканы мастацкі выраб не толькі падкрэслівае даўнасць эканамічных і культурных сувязей краіны, але і накіроўвае ў прастору і далячынь. Каларыстыка фасада і інтэр'ераў вытрымана ў адценнях "беларускага шоўку" – ільну (малюнак 6, *а*).

Пластыка і каларыстыка фасадаў павільёна "Васілёк" аддалена суадносяцца з вобразам кветкі, якую беларусы называюць валошкай-васільком, дынамізмам і лёгкасцю выяўляюць напрамак руху і, адначасова, падкрэсліваюць гасціннасць аб'екта. У рашэнні інтэр'ера невялічкай залы для інфармацыйных зносін і стасункаў ужыты матэрыялы з натуральным колерам, а форма асвятляючага абсталявання сваёй кампазіцыяй нагадвае белыя наміткі – даўнія святочныя галаўныя ўборы беларусак (малюнак 6, *б*).

Лаканічны па форме павільён з назвай "Аазіс" аснашчаны сучасным тэхналагічным абсталяваннем, а галоўныя нацыянальныя адметнасці адлюстраваны ў функцыянальным і мастацкім вырашэнні інтэр'ераў. Так, упрыгожваннем прасторы галоўнай залы павільёна з'яўляецца падвешаная пад столлю дэкаратыўная канструкцыя для штучнага асвятлення, выкананая па матывах даўнейшых народных абярэгаў – саламяных "сонцаў" , "зорак" і "павукоў" – і размешчаная ў атачэнні белых прасторавых формаў, падобных да стужак і стылізаваных карункаў, якія ствараюць зменлівыя светлавыя і глыбінна-прасторавыя эфекты (малюнак 6, *в*).

Аўтары праекта "Зямля пад белымі крыламі" імкнуліся аб'яднаць у знешнім выглядзе пабудовы розныя кампазіцыйныя, прасторавыя і каларыстычныя вырашэнні. Дынамічныя формы будынка, блакіт крышталя і чорна-белыя элементы светлапранікаючых канструкцый павільёна пры разглядванні з розных кропак асацыіруюцца з палётам белага бусла над мнагаводнымі беларускімі рэкамі і азёрамі і ў той жа час падкрэсліваюць загадкавасць незнаёмага многім іншаземцам беларускага краю, які мае яшчэ адну паэтычную назву: "Зялёны лісток на планеце Зямля" (малюнак 7, *а*).

Для лаканічнага аб'ёма павільёна "Сонца. Жыццё. Росквіт" і яго атачэння аўтарамі знойдзена выразнае колеравае і графічнае вырашэнне, заснаванае на сімвалах і колерах беларускіх арнаментаў, якімі ў народным быце аздабляліся вышываныя ручнікі. Малыя архітэктурныя формы і зялёныя насаджэнні пры галоўным уваходзе арганічна ўпісаны ў невялікую прастору і ствараюць пазітыўныя эмоцыі ў наведвальнікаў (малюнак 7, *б*).



*а*




*б*

***а* – "Зямля пад белымі крыламі". *Н. Аржанцава, К. Грамыка, Б. Саковіч*;**
***б* – "Сонца. Жыццё. Росквіт". *Г. Чыкунова, Ю. Булдаў***

**Малюнак 7. – Сімволіка формы і арнаменту ў кампазіцыі і вонкавым аздабленні павільёна Беларусі**

Ва ўсіх прыведзеных вышэй ілюстрацыях з фрагментамі дызайн-праектаў бачна, што архітэктура павільёнаў пабудавана на дакладна выражанай кампазіцыйнай структуры, пашыраным ўжыванні эмацыйнага і сімвалічнага гучання колера.

Адным з прыкладаў прафісійнага выяўлення ў архітэктуры абагульненага каларыту Беларусі можа служыць павільён Беларусі на ЭКСПО-2015 у Мілане, у кампазіцыі якога выкарыстаны натуральныя колеры прыродных складнікаў, асобныя сімвалічныя знакі і выявы старадаўняй і сучаснай тэхнікі.

Пластычнае вырашэнне гэтага аб’екта адлюстроўвае не толькі стан тыповай архітэктурна-ландшафтнай прасторы Беларусі, але і структуру асобных пабудоў (малюнак 8).



***а*** ***б***

***а*** **– дызайн-канцэпцыя “Кола жыцця”.** ***Архітэктары І. Казюлькоў, Д. Беляковіч, І. Шыпілаў.*** **2011;**
***б*** **– каларыстыка прыродных матэрыялаў і тэхнічных экспанатаў у кампазіцыі ўваходнй зоны. 2015.**

**Малюнак 8. – Праект і ўвасабленне павільёна Беларусі для ЭКСПО-2015 у Мілане**

**Заключэнне.** У беларускай архітэктуры здаўна існуюць такія адметнасці, як выразная сумаштабнасць пабудовы з прыродным атачэннем і ансамблевасць забудовы ва ўрбанізаваных прасторах, а мастацкія асаблівасці гістарычных і сучасных архітэктурных аб’ектаў, надзеленых выразным абліччам і менавіта беларускім каларытам, выклікаюць цікавасць у гасцей з разнастайных замежных краін і рэгіёнаў. Трэба адзначыць, што чым больш новыя архітэктурныя аб’екты адпавядаюць прыродна-кліматычным і прасторавым умовам, тым ярчэй змогуць праявіцца ў іх нацыянальныя рысы.

Натурныя і тэарэтычныя даследванні сучаснай архітэктурнай каларыстыкі сведчаць аб арганічным суіснаванні найноўшых будаўнічых тэхналогій і эмацыянальна-вобразных мастацкіх асноў, узнятых да ўзроўня сімвалаў. Выкарыстанне ў архітэктуры колеравых знакаў, ўтрымліваючых у сабе набыткі багатай колеравай культуры, прыбліжаюць нас да ўсведамлення складанага пачуцця – колеравага нацыянальнага каларыту Беларусі. Сучасны архітэктар, як і мастак, павінен валодаць адчуваннем і разуменнем новых з’яў жыцця, іх якасцей і асабовых прыкмет, якія могуць быць увасоблены ў нацыянальнай архітэктуры.

ЛІТАРАТУРА


1. Бреслав, Г.Э. Цветопсихология и цветолечение для всех / Г.Э. Бреслав. – СПб. : Б.&К., 2000. – 212 с.
2. Ефимов, А.В. Колористика города / А.В. Ефимов. – М. : Стройиздат, 1990. – 272 с.
3. Лакотка, А.І. Народнае дойлідства / А.І. Лакотка. – Мінск : Беларус. навука, 2014. – 200 с.
4. Некрасов, А.И. Теория архитектуры / А.И. Некрасов. – М. : Стройиздат. – 1994.
5. Сардаров, А.С. Архитектура транспортных сооружений / А.С. Сардаров. – Минск : БНТУ, 2013. – 128 с.
6. Гісторыя беларускага мастацтва : у 6 т. / гал. рэд. С.В. Марцэлеў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987–1994.


*Паступіў 05.12.2017*

**MODERN ASPECTS OF IDENTIFYING MAIN CHARACTERISTICS OF THE NATIONAL PARTICULARITY IN THE COLOR CULTURE AND ACHITECTURE OF BELARUS**

***V. BADZIAKA, M. KABAEVA, G. ZAKHARKINA***

*The article describes main components of the color culture. It shows how the heritage of the ancient Belarusian architecture and the color culture are connected to the development of the modern research trends on the national particularity in architecture. A number of works of art and architecture of Belarus are given as example in order to analyze the emotional state of human and color environment.*

***Keywords:*** *color environment, culture, color, colour, emotional and psychological effect, associations, symbols, formalization, architecture, project, graphic arts, pictorial art, national particularity.*